УДК 947.6 «1917»

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# ПАДЗЕІ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ВНУ

The article dwells upon the February revolution's main events which are reflected in learning aids for higher educational institutions. The theoretical level and methodology of expounding questions of the February Revolution progress in "History of Belarus" textbook edited by Pr. Ya. Novik and Pr. G. Martsul. Numerous inaccuracies and doubtful facts given there are stated; the reasons for them are the lack of necessary authors' qualification, their ignoring the latest achievements in this field and applying Marxist-Leninist methodology along with the party (the CPSS) literature.

**Уводзіны.** У выніку працы ўдзельнікаў «круглага стала» пад назвай «Расійскія рэвалюцыі 1917 года ў лёсе Беларусі», які адбыўся 19 верасня 2007 г. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, у ліку іншага было вырашана абмеркаваць праблему «як неабходна адлюстроўваць рэвалюцыйныя падзеі на старонках падручнікаў і дапаможнікаў для вучняў агульнаадукацыйных школ і студэнтаў ВНУ» [1, с. 16] З гэтай нагоды лічым неабходным выказаць заўвагі па тым, як падзеі Лютаўскай рэвалюцыі асветлены ў «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля [2, 3].

**Асноўная частка.** У парушэнне храналагічнага прынцыпу і насуперак здароваму сэнсу гэты матэрыял змешчаны ў дзвюх частках падручніка, прычым пад рознымі назвамі. Яго варта было б пачаць з характарыстыкі становішча ў краіне напярэдадні краху самаўладдзя. Інакш названыя прычыны рэвалюцыі – «класавыя супярэчнасці, цяжкае ваеннае становішча» – не выглядаюць пераканаўчымі, бо такія ж цяжкасці перажывалі многія краіны – удзельніцы вайны. Няма падстаў гаварыць і пра «масавыя выступленні супраць царызму, буржуазіі і рэакцыйнай ваеншчыны» [2, с. 364]. Заўважым, што ў пачатку 1917 года аўтарытарны рэжым яшчэ дастаткова дзейсна выяўляў сябе, у тым ліку на Беларусі. Мае рацыю Я. І. Трашчанок, калі піша, што «фатальнай непазбежнасці рэвалюцыйнага выбуху ў Расіі не існавала» [4, с. 18] і ён з'явіўся поўнай нечаканасцю для ўсіх. Таму ролі ўсяго народа ў рэвалюцыі не варта перабольшваць. На справе крах самаўладдзя быў перадвызначаны перамогай узброенага паўстання ў сталіцы. Не апошнюю ролю ў лёсе манархіі адыграў сам Мікалай II, слабавольны, дыскрэдытаваны распуціншчынай, дэмаралізаваны здрадай акружэння і г. д. Дарэчы, яго апошнім указам адбылося зацвярджэнне кабінета міністраў на чале з Г. Я. Львовым. З абвяшчэннем 3 сакавіка Дэкларацыі Часовага ўрада ўся грамадскасць безумоўна прыняла перамены ва ўладзе і згуртавалася вакол яго як гаранта дэмакратычных пераўтварэнняў.

Прыняць тэзіс, быццам «меншавіцка-эсэраўскае кіраўніцтва Саветамі баялася ўзяць уладу ў свае рукі, пайшло на змову з буржуазіяй, і ў выніку быў створаны Часовы буржуазны ўрад», значыць кінуць цень на ўсе «непралетарскія» партыі, меўшыя дачыненне да стварэння і дзейнасці вышэйшага органа ўлады. Мяркуем, такая аўтарская ўстаноўка не спрыяе асэнсаванню студэнтамі аб'ектыўнай неабходнасці супрацоўніцтва ўсіх, як тады казалі, «жывых сіл» па ўмацаванні новага ладу.

Называць Саветы органамі ўлады, як гэта робяць аўтары [2, с. 364], няма падстаў. На гэты факт, а таксама на беспрадметнасць размоў аб «двоеўладдзі», даўно ўказвалі гісторыкі, у тым ліку П. Ц. Петрыкаў [5, с. 85].

Беспадстаўна атаясамліваць загады ваеннага камандавання з дзейнасцю «ворагаў рэвалюцыі» [2, с. 365], бо гвалтоўныя акцыі «агітатараў» і «рэвалюцыйных салдат» у Рэжыцы, Гарадку, Рагачоўскім пав. патрабавалі адэкватных захадаў. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам таксама нічым не выявіў сваёй варожасці рэвалюцыі і нават прыняў парад у Мінску пасля прысягі салдат Часоваму ўраду [6, с. 14].

Так жа беспадстаўна пісаць аб планах мінскіх бальшавікоў 1–2 сакавіка «мабілізаваць усе сілы, каб падтрымаць піцерскіх рабочых і салдат» [2, с. 336], бо ў тым ужо не было патрэбы. Звесткі аб «баявых дружынах мінскіх рабочых», якія «2 сакавіка вызвалілі з турмы 400 палітычных зняволеных», няпраўда. Такой іх колькасці не магло быць па ўсёй Беларусі. У мінскай турме знаходзілася 753 вязняў, з якіх толькі 24 – «адміністратыўных» [7], і іх вызваленне адбывалася не «баявымі дружынамі», а зусім законна і арганізавана.

У адпаведнасці з партыйнай традыцыяй аўтары пачынаюць асвятленне рэвалюцыйных перамен са стварэння Саветаў. Варта толькі ўдакладніць, што адзіны Віцебскі Савет так і не быў створаны, а Магілёўскія Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў аб'ядналіся недзе ў 20-х чыслах сакавіка [8, с. 36]. Характэрна, што ў гэтай частцы тэкста ўжо ні словам не прыгадваецца ні аб двоеўладдзі, ні аб Саветах як органах улады. Мала таго, як вынікае з тэксту, яны па волі эсэра-меншавіцкага кіраўніцтва «фактычна падпарадкоўваліся органам Часовага ўрада» [2, с. 367] На справе, разглядаючы сябе органамі «рэвалюцыйнай дэмакратыі», закліканымі стаяць на абароне новага ладу і ў яго асобе Часовага ўрада, Саветы скіроўвалі сваю энергію

на ажыццяўленне ў межах існаваўшага заканадаўства інтарэсаў працоўных і салдат, падтрымку Петраградскага, а пазней – Усерасійскага Саветаў.

Ведучы гаворку пра ўсталяванне новай улады ў краіне, у тым ліку на Беларусі, правільна пачынаць яе з асвятлення арганізацыі камітэтаў грамадскай бяспекі, якія ставілі на мэце захаванне парадку ў гарадах, мястэчках, а не імкнуліся «звузіць размах народнай рэвалюцыі» [2, с. 367]. Дарэчы, у мінскім камітэце не было прадстаўніцтва ад «згодніцкіх партый», «буржуазіі і памешчыкаў». У яго былі дэлегаваны прадстаўнікі ўрадавых, земскіх, думскіх, грамадскіх устаноў, канфесій і нацыянальных пластоў [8, с. 27].

З моманту ўтварэння склад органаў Часовага ўрада не заставаўся нязменным. Прычым роля Саветаў у гэтым была калі не галоўнай, то вельмі значнай, аб чым сведчыць, у прыватнасці, ахіленне ад пасад 2 губернскіх (віцебскага і магілёўскага), а таксама мноства павятовых камісараў. Іх абранне на гэтыя пасады стала адметнай з'явай, уласцівай дэмакратычнаму ладу.

У асвятленні аўтараў дзейнасць рабочых у сакавіку выглядае даволі сціплай, а ў другой частцы падручніка ўжо сцвярджаецца, быццам «на чале барацьбы за развіццё рэвалюцыі стаяў рабочы клас» [3, с. 12]. Тое, што рабочы клас «*прымаў* **(курсіў наш – М. С.)** удзел у арганізацыі Саветаў, народнай міліцыі, узброеных дружын», зусім не значыць, што ён стаяў «на чале барацьбы за развіццё рэвалюцыі». Гэты тэзіс слаба аргументаваны яшчэ і таму, што, па-першае, ніякай неабходнасці ў азначанай «барацьбе» не існавала. Па-другое, яшчэ вясной на большасці прадпрыемстваў была рэалізавана асноўная мэта рабочых – 8-гадзінны працоўны дзень [8, с. 90].

Заўважым, што Саветы рабочых дэпутатаў і прафсаюзы адстойвалі эканамічныя інтарэсы працоўных з дапамогай прыміральных камер і толькі ў крайніх выпадках скарыстоўвалі забастоўкі. Фабрычна-заводскія камітэты распаўсюджвання на Беларусі не мелі і прыкметнай ролі ў рабочым руху не адыгрывалі.

Арганізацыя сялянства пачалася не «па ініцыятыве бальшавікоў» [2, с. 368]. 23 сакавіка быў выбраны не «сялянскі камітэт Мінскай губерні», а камітэт Сялянскага саюза [8, с. 40]. Акцэнтаванне ўвагі на эсэраўскім кіраўніцтве сялянскімі арганізацыямі не заўсёды мае сэнс. Настроі і паводзіны сялянства не выходзілі за межы гаспадарчых інтарэсаў і не звязваліся з палітыкай.

Дэмакратызацыя армейскага жыцця пачалася з загаду ваеннага міністра А. Гучкова аб скасаванні катэгорыі «ніжніх чыноў». Але «салдаты ўраўноўваліся ў правах з усімі грамадзянамі краіны» не ў сакавіку, а ў маі, пасля Дэкларацыі, падпісанай чарговым ваенным міністрам [8, с. 79]. Інфармацыя аб Франтавым з'ездзе выглядае ўзважанай, пазбаўленай тэндэнцыйнасці, і пераконвае ў вызначальнай ролі вайскоўцаў, а не рабочых ва ўсталяванні новага ладу на Беларусі.

Як вынікае з назвы главы І другой часткі падручніка «Беларусь пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі», аўтары традыцыйна адводзяць ёй (рэвалюцыі) вельмі сціплае месца «пралога Кастрычніка» [2, с. 363]. Разважанні наконт «альтэрнатыў грамадска-палітычнага развіцця» – не болей, чым спроба лішні раз паказаць непазбежнасць сацыялістычнай рэвалюцыі. Адсюль – усе «прэтэнзіі» да «буржуазнага Часовага ўрада». У іх падмацаванне выкарыстана, акрамя іншага, замоўчванне станоўчых крокаў па вырашэнні харчовай праблемы (хлебная манаполія), прадухіленні аграрнага руху (харчовыя і зямельныя камітэты), скасаванні дыскрымінацыйных законаў у дачыненні яўрэяў, наданні гарантый палякам на адраджэнне іх дзяржаўнасці і іншае.

Нельга пагадзіцца і з ацэнкай партый эсэраў і меншавікоў як дробнабуржуазных, а выказаны тэзіс, быццам разам з буржуазнымі партыямі яны «падтрымлівалі ідэю адзінай і непадзельнай Расіі» [3, с. 8, 10], з арсеналаў самага задубянелага сталінізму.

Варта адзначыць, што асобныя аспекты тэмы грунтуюцца на агульнапрызнаных палажэннях і асаблівых пярэчанняў не выклікаюць. Гэта невыпадкова, бо, да прыкладу, характарызуючы беларускі рух, аўтары абапіраліся на «Энцыклапедыю гісторыі Беларусі». Але і тут іх «творы» падыход выявіўся ў расстаноўцы класавых акцэнтаў. Каб падкрэсліць «правізну» ўдзельнікаў з'езда «беларускіх дзеячаў», ініцыятарам яго склікання называецца БНПС, якая ўтварылася толькі ў маі. Акрамя таго, асноўным вынікам беларускага руху падаецца раскол на правую і левую плыні, хаця факт утварэння ВБР і праграма яе дзейнасці сведчаць аб зваротным. Нарэшце, такая выснова не стасуецца з загалоўкам «Уздым беларускага руху».

У шэрагу выпадкаў словы аб ўзрастанні ўплыву бальшавікоў не падмацоўваюцца фактамі. Тэзіс аб іх «вялікай увазе згуртаванню пралетарыяту» [3, с. 12] з галіны фантазій, паколькі сам пралетарыят, як вынікае з выступлення А. Мяснікова на VI з'ездзе РСДРП(б), меў іншыя ідэйныя і палітычныя арыенціры [8, с. 65]. Дададзім, што гомельскія бальшавікі не былі ў аб'яднанай арганізацыі» [3, с. 12], а магілёўскія і многія іншыя заставаліся ў ёй да кастрычніка [8, с. 64].

У асвятленні праблемы вайны і міру аўтарам таксама варта было б часцей абапірацца на

факты, а не галаслоўна заяўляць, быццам з захопніцкімі мэтамі, «а таксама для задушэння рэвалюцыйнага руху», Часовы ўрад вырашыў працягваць імперыялістычную вайну «да пераможнага канца» [3, с. 14.] Відавочна, такія ж мэты праследаваў і кааліцыйны ўрад пасля адстаўкі П. Мілюкова? Пэўна ж не. Ідэя актыўных баявых дзеянняў рускай арміі мела на мэце прымусіць праціўніка пайсці на мірныя перагаворы. Наколькі лозунг летняга наступлення быў папулярным на Беларусі – сведчаць рэзалюцыі Франтавога камітэта, сялянскіх з'ездаў, а таксама масавыя маніфестацыі 18 чэрвеня, якія прайшлі ў гарадах Беларусі не «пад бальшавіцкімі» [3, с. 14], а пад наступальніцкімі лозунгамі [7, с. 135].

У Часовага ўрада былі падставы лічыць бальшавікоў віноўнікамі правала наступлення, але асноўнай прычынай ліпеньскага крызісу стаў выхад кадэтаў з урада ў знак пратэсту супраць палітыкі А. Керанскага ва ўкраінскім пытанні. У той самы час памылкова заяўляць, што ў выніку разгону «мірнай дэманстрацыі», якая адбывалася пад лозунгам пераходу ўлады Саветам, «буржуазія атрымала ўсю паўнату ўлады». Інакш ёй не спатрэбілася б «развязваць грамадзянскую вайну, каб узброеным шляхам задушыць рэвалюцыю» [3, с. 14].

Партыйна-класавы падыход не дазволіў аўтарам разабрацца і ў мэтах склікання Дзяржаўнай нарады. Нягледзячы на самае шырокае прадстаўніцтва на ёй грамадскіх, партыйных, дзяржаўных і многіх іншых арганізацый і структур, зацікаўленых у стабілізацыі становішча ў краіне і на франтах, гэты форум характарызуецца выключна негатыўна. Рэзалюцыя падаўляючай большасці яго ўдзельнікаў, прынятая ў канструктыўным рэчышчы, нічым не даказвае таго, што заправіламі нарады была буржуазія. Галаслоўнымі з'яўляюцца сцвярджэнні, быццам удзельнікі нарады падтрымалі прапанаваную Карнілавым «праграму дзеянняў контррэвалюцыі», надзялілі «буржуазны ўрад надзвычайнымі паўнамоцтвамі» [3, с. 14–15]. Далейшы ход падзей (выступленне Карнілава) абвяргае гэта, паколькі ўся грамадскасць Расіі выступіла ў абарону дэмакратыі і «буржуазнага Часовага ўрада». На Беларусі нават кадэты адмежаваліся ад мяцежнікаў, а суадносіны сіл склаліся такім чынам, што мяцеж быў падаўлены без адзінага стрэлу. Звесткі аўтараў пра «штаб рэвалюцыйных сіл на чале з М. Фрунзе» [3, с. 15] памылковыя ў прынцыпе. Усе «рэвалюцыйныя сілы» ўзначальваў Часовы рэвалюцыйны камітэт на чале з эсэрам палкоўнікам А. Каратковым [9, с. 3–12].

Аўтары канстатуюць факт узрастання аўтарытэту бальшавікоў пасля карнілаўшчыны і звязваюць з ім «далейшым развіцці рэвалюцыі». Усе разважанні пра падкопы буржуазіі, імкненне правых «да ўсталявання дыктатуры» [3, с. 17], пра «выбар – улада Саветам ці дыктатура контррэвалюцыйнай буржуазіі» – не больш, чым лозунгі бальшавікоў на выбарах ва Устаноўчы сход. На справе, пасля разгрому карні-лаўскага выступлення, калі армія канчаткова выйшла з-пад кантролю генералаў і афіцэраў, спадзяванні правых сіл на фарміраванне моцнай улады зніклі канчаткова. Гэтую, дарэчы, акалічнасць у ліку іншых і выкарысталі бальшавікі, якія пад выглядам барацьбы з контррэвалюцыяй разгарнулі падрыхтоўку ўзброенага паўстання.

Пафасныя сентэнцыі, быццам «барацьба народных мас супраць буржуазіі дасягнула небывалага размаху», а «ў цэнтры яе стаяў пралетарыят – авангард рэвалюцыі»; быццам выступленні рабочых насілі «пераважна палітычны характар» – з жанру белетрыстыкі. У іх – ні слова праўды. На справе за паслялютаўскі час на Беларусі не адбылося ніводнага выступлення працоўных пад антыўрадавымі лозунгамі [8, с. 90, 170].

У абгрунтаванне тэзісу аб тым, што «барацьба сялянства за зямлю» набыла «агульнанацыянальнае палітычнае значэнне», даецца статыстыка разгромаў памешчыцкіх двароў. Мяркуем, што разгромы не маюць прамога дачынення да палітыкі. Інакш цяжка растлумачыць, чаму яны працягваліся нават пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Да таго ж, не мог «у кастрычніку сялянскі рух ахапіць 40 паветаў Беларусі», бо іх было толькі 34 [3, с. 16].

Сяляне і рабочыя выступалі паасобку і ніякай «агульнай плыні рэвалюцыйнага руху Беларусі» ствараць не маглі. Па той жа прычыне да яе не маглі далучыцца салдаты Заходняга фронту, занятыя «выступленнямі супраць вайны», дэзерцірствам, братаннямі з немцамі. На гэтым фоне тэзіс, быццам «да кастрычніка 1917 г. выступленні пралетарыяту, сялянства Беларусі і салдат Заходняга фронту згуртаваліся ў адзіную плынь, была створана армія сацыялістычнай рэвалюцыі», гучыць непераканаўча.

Аўтары выключна негатыўна характарызуюць ролю Часовага ўрада пасля Лютаўскай рэвалюцыі, які не браў на сябе вырашэнне задач кардынальнай значнасці (дзяржаўнага ўладкавання, зямельнага, рабочага, нацыянальнага і іншых пытанняў), бо яны з'яўляліся прэрагатываю Устаноўчага сходу. Усё іншае, якое патрабавала неадкладнага вырашэння – скасаванне рудыментаў самаўладдзя ў заканадаўстве і сістэме дзяржаўнага кіравання, дэмакратызацыі грамадскага жыцця, рэалізацыі харчовых праграм, утварэння зямельных камітэтаў для падрыхтоўкі аграрнай рэформы – гэтыя захады з большай ці меншай ступенню паспяховасці выконваліся. І нельга сказаць, што час дэмакра-

тычнага рэфармавання грамадства і эканомікі сябе вычарпаў, бо апошняе слова заставалася за Устаноўчым сходам.

**Заключэнне**. На нашу думку, разгледжаныя матэрыялы з гісторыі Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі не адпавядаюць заяўленаму статусу падручніка. Іх недарэчная структура, адсутнасць выразнага прынцыпу асвятлення падзей, вузкае кола дзеючых асоб і іншыя хібы сведчаць пра адсутнасць у прафесараў Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля спецыяльных ведаў. Таму, відавочна, аўтары замясілі сваю трактоўку рэвалюцыйных падзей на Беларусі на «старой добрай» марксісцка-ленінскай метадалогіі з выкарыстаннем апрабіраваных твораў, дзе прынцып партыйнасці прызнаецца найпершым і абавязковым для ўсіх астатніх. Такі «навуковы» падыход дазволіў ім пазбегнуць нязручных пытанняў і абысці сучасныя навуковыя працы. У выніку з-пад прафесарскіх пер'яў выйшаў фрагмент гісторыі КПСС, стылізаваны пад гісторыю Беларусі часоў Лютаўскай рэвалюцыі, і таму няма сэнсу шукаць у ім аб'ектыўнай інфармацыі.

У выхаваўчым плане гэты твор прасякнуты ідэямі адной партыі, якія карэнным чынам разыходзяцца з задачамі выхавання ў моладзі ўласцівай беларусам талерантнасці, сацыяльнага міру, павагі да дэмакратычных свабод і агульначалавечых каштоўнасцей.

Такія ж хібы ўласцівы вучэбнаму дапаможніку І. І. Коўкеля, у значнай ступені – П. Г. Чыгрынава, у асобных момантах – П. І. Брыгадзіна [10]. Шляхі іх перадолення – у выкарыстанні навуковых падыходаў, разнастайных метадаў і сучаснай літаратуры, павышэнні прафесійнага ўзроўню аўтараў.

### Літаратура


1. Расійскія рэвалюцыі 1917 года ў лёсе Беларусі (матэрыялы «круглага стала», які адбыўся 19 верасня 2007 г. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі) // Беларускі гістарычны часопіс, 2008 – № 1. – С. 15.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.: падруч. / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 2007. – 398 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г. – 2006: падруч. / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 2007. – 445 с.

4. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высш. образования: в 2 ч. Ч. 2 / Я. И. Трещенок [и др.]; под ред. Я. И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2005. – 310 с.

5. Петриков, П. Т. Очерки новейшей историографии (1990-е – начало 2000-х гг.) / П. Т. Петриков. – Минск: Белорус. наука, 2007. – 292 с.

6. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Мінску (сакавік – кастрычнік 1917 г). Вучэбны дапам. па курсе «Гісторыя Беларусі»/ М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 1994. – 112 с.

7. В губернской тюрьме // Новое варшавское утро. – 1917. – 22 фев. – С. 3.

8. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. Ч. I. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 2001. – 200 с.

9. Сяменчык, М. Я. Керанскі супраць Карнілава: чыя перамога? //Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 8.

10. Ковкель, И. И. История Беларуси: с древнейших времен и до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – 6-е изд. – Минск: Аверсэв, 2006. – 605 с.; Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П. Г. Чигринов. – 3-е изд., испр. – Минск: Выш. шк., 2007. – 463 с.; Бригадин, П. И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций / П. И. Бригадин. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2007. – 336 с.